гісторыі свайго роду, генеалогія вяртаецца з небыцця і развіццё кожнага яе кірунку з'яўляецца першачарговай задачай для кожнага даследчыка генеалогіі.

**Літаратура**


1. *Антонов Д.Н., Антонова И.А.* Метрические книги России XVIII – начала XX в. М., 2006.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: Сборник документов. Мн., 1983. Т.1.
3. Белоруссия в эпоху капитализма: Сборник документов. Мн., 1990. Т.2.
4. Восстание 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии: Сборник документов. М., 1965.
5. Гісторыя сялянства Беларусі. Мн., 1997. Т.1.
6. Гісторыя сялянства Беларусі. Мн., 2002. Т.2.
7. *Заливако А.С.* Историография генеалогии Беларуси (X–XXI вв.). СПб., 2004.
8. Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права. Мн., 1959.
9. *Михеенок Т.С.* Павичи – род крестьянский // Архівы і справаводства. 2001. № 2. С. 103–107.
10. *Носевич В.Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Мн., 2004.
11. *Рыбчонак С.А.* Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст.: Метадычныя парады. Мн., 2003.
12. *Савелов Л.М.* Лекции по русской генеалогии, читанные в Московском археологическом институте. М., 1994.
13. *Станішэўскі В.М.* Родословная Станишевских. Мн., 1997.
14. *Станішэўскі В.М.* Радавод сям'і Улашчыкаў: гістарычны нарыс. Мн., 2001.
15. Фонды Национального исторического архива Беларуси: Справочник. Мн., 2006.
16. *Чижова Н.Н.* Генеалогия крестьянского рода XVIII–XX веков. Тверь, 2004.
17. *Яцкевіч З.Л.* Радавод Максіма Багдановіча. Мн., 1999.


## ПАРАДАК ВЯДЗЕННЯ СПРАВАВОДСТВА ПА СКАРГАХ У БЮРО СКАРГАЎ НК РСІ БССР


### Н. У. Юркевіч


Першая трэць мінулага стагоддзя – час гіганцкіх сацыяльных катаклізмаў і патрасенняў, захаду і распаду традыцыйнай сялянскай культуры, фарсіраванай індустрыялізацыі краіны і суцэльнай калектывізацыі, што праводзіліся пад сцягам будаўніцтва сацыялізму. У зваротах знаходзілі сваё адлюстраванне ўспрыняцце рэвалюцыйных пераўтварэнняў звычайным чалавекам, яго погляд на прыроду і сутнасць новай улады, на новае дзяржаўнае і грамадскае ўладкаванне, яго сэнс і назначэнне, супастаўленне старых і новых парадкаў; рэакцыя насельніцтва на розныя мерапрыемствы бальшавіцкага кіраўніцтва, на падзеі грамадзянскай вайны, на палітыку «асаднага камунізму», харчразвёрстку на вёсцы, на ўзнікшыя ў краіне хаос і дэзарганізацыю; адносіны да правядзення новай эканамічнай палітыкі, фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскай Інспекцыі БССР (НК РСІ БССР) быў створаны 17 снежня 1920 г. (дзейнічаў да сакавіка 1934 г.). На гэты камісарыят быў ускладзены шэраг задач, у тым ліку і назіранне за арганізацыяй ва ўсіх установах прыёму living розпага роду зваротаў і за адказамі на іх. Для ажыццяўлення апошняй задачы пры НК РСІ БССР было арганізавана Бюро Скаргаў, якое прымала скаргі на няправільныя дзеянні і распараджэнні ўсіх устаноў і службовых асоб, падначаленых Наркамату РСІ. Дзейнасць Бюро Скаргаў НК РСІ БССР слаба асвечана ў літаратуры, таму паспрабуем вызначыць парадак вядзення справаводства па зваротах у Бюро, выкарыстоўваючы архіўныя дакументы.

Інструкцыя Бюро Скаргаў РСІ БССР ад 4 кастрычніка 1922 г. устанавіла, што «канцелярская работа по Центральному Бюро Жалоб выполняется делопроизводителем Бюро, в уездах – аппаратом Уполномоченного, а в волостях Волисполкомом» [1, арк. 13]. У адпаведнасці з гэтай Інструкцыяй «всем поступающим жалобам ведется точный учет, как движения, так и заключения, для чего ведется настольный реестр» [1, арк. 13].

Дакладная запіска загадчыка Бюро Скаргаў І.А.Мількамановіча Народнаму Камісару РСІ БССР (датавана 1921 г.) змяшчае наступны парадак выканання скаргаў і заяў у Бюро:

«…Поданные лично жалобы и заявления с пометкой о времени приема и подписью принявшего передаются в регистратуру для записи в реестр входящих бумаг, после чего также как и полученные по почте – поступают к заместителю заведывающего Бюро, который докладывает их заведывающему или, в случае отсутствия всяких сомнений о направлении их, самостоятельно делает распоряжения по ним. Наиболее сложные, а также имеющие принципиальный характер жалобы и заявления докладываются Наркому РКИ или его заместителю, или вносятся в ближайшее заседание коллегии Бюро Жалоб.

Распоряжения по жалобам делаются не позже следующего за поступлением их дня.

Распоряжения заведывающего или его заместителя с надписью срочно исполняются в тот же день; все же остальные должны быть исполнены не позже следующего за наложением резолюции дня.

Все делопроизводственные бумаги подписываются заведывающим Бюро и его заместителем или инспектором по поручении заведывающего; позднейшие из них подписываются, кроме того, Наркомом РКИ или его заместителем» [2, арк. 15]. Названы дакумент таксама патрабаваў выдаваць па просьбе заяўніка даведкі аб руху скаргаў і адзначаць усе

галоўныя моманты руху скаргі ў настольным рэестры Бюро Скаргаў.

Для ўліку пісьмовых і вусных скаргаў і заяў і кантролю іх выканання ў Бюро была ўстаноўлена адзіная форма рэгістрацыйнай карткі. Таксама выкарыстоўваліся формы адкрытых пісьмаў з адказам на скаргу і аб накіраванні звароту па месцы вырашэння пытання, пісьма-напамінання.

«Інструкцыя аб рабоце бюро скаргаў на мясцох» прадпісвала «завесьці сталы контроль і праверку як за праходжаньнем узьнятых спраў, так за выкананьнем рашэньняў бюро скаргаў, організоўваючы брыгады дзеля гэтай праверкі» [3, с. 73]. Пасля разгляду і вырашэння скарга здымалася з кантролю, аб чым рабілася адпаведная адзнака ў журнале рэгістрацыі і кантрольнай картцы. Пасля гэтага кантрольная картка перадавалася ў архіў. Як правіла, распараджэнне аб зняцці скаргі або заявы з кантролю давала тая асоба, якая прымала па іх рашэнне.

З мэтай паляпшэння пастаноўкі даведачнай работы па скаргах і заявах практыкавалася стварэнне ў дадатак да іх алфавітаў і картатэк. Правілы карыстання такім алфавітам былі наступныя: «Спачатку пішацца прозьвішча, імя і па бацьку, затым № карткі, на якой зарэгістравана сутнасьць скаргі, пасьля нумар справы, у якой захоўваюцца скончаныя перапіскі па скаргам і чарговы нумар перапіскі ў гэтай справе. Напрыклад: у алфабэце значыцца «Карась Петра Рыгораў 113-3-18». Гэта значыць, што перапіска па скарзе Карася П.Р. зарэгістравана на картачцы № 113, яна ўжо скончана і знаходзіцца ў справе № 3 і ляжыць у ёй 18-ай па чарзе» [4, тыт. арк.]. Размяшчэнне прозвішчаў заяўнікаў ў алфавітным парадку дазваляла хутка атрымліваць неабходныя даведкі.

Супрацоўнік ЦКК-НК РСІ БССР Я. Ракаў даваў наступныя рэкамендацыі па пытаннях арганізацыі даведачнай работы па зваротах:

«У радзе выпадкаў скаргі спэцыяльна рэгіструюцца ў журналах альбо ў рэестрах для мэт даведкі, але гэтых мэт яны не дасягаюць. Лепш за ўсё скаргі разьмяркоўваць паводле альфабэту па мэтоду вэртыкальнага хаваньня ў невялікіх папках з шчыльнай паперы, шыфруючы кожную папку па прозьвішчы скаргаўшчыка.

Што да тых скаргаў, якія павінны пасылацца ў іншую ўстанову для навядзеньня даведкі, для расьсьледаваньня, якое чакаецца потым з заключэньнем, дык на іх можна завесьці спэцыяльныя карткі, якія таксама павінны раскладацца паводле альфабэту, таму што звычайна падавец скаргі просіць даведкі аб ходзе яго справы, і прасьцей за ўсё даведку знайсьці паводле альфабэту, па яго прозьвішчы.

Калі сама скарга застаецца ва ўстанове, але пасылаецца запытаньне ў іншую ўстанову, тады скарга сама па сабе ляжыць у звычайным парадку паводле альфабэту, а на запытаньне, у выпадку неабходнасьці контроляваць атрыманьне адказу, ставіцца картка ў мэміндэкс для

кантролю выкананьня» [5, с. 111–112].

Як правіла, аналіз зваротаў ажыццяўляўся ў форме штомесячных аглядаў або зводак работы па разглядзе і вырашэнні скаргаў [6, с. 63]. «Ежемесячно к 5-му числу делается сводка … и представляется в высшее Бюро», – гэта патрабаванне змяшчала Інструкцыя Бюро Скаргаў РСІ БССР ад 4 кастрычніка 1922 г. [1, арк. 13]. На аснове такіх зводак затым устанаўліваліся прычыны, якія выклікалі падачу скаргаў і заяў; высвятлялася, якімі падведамаснымі органамі і падпарадкаванымі службовымі асобамі былі дапушчаны незаконныя дзеянні; падлічвалася колькасць скаргаў і заяў асобна па кожнай з прычын. Цыркуляр НК РСІ РСФСР ад 4 ліпеня 1922 г. № 14 вызначыў парадак падліку скаргаў для складання зводак аб дзейнасці Бюро Скаргаў: «При подсчете жалоб, поданных от имени нескольких лиц, некоторые Бюро Жалоб в своих отчетах в разделе «Кто подавал жалобы» показывают общее число всех жалобщиков, от имени которых были поданы жалобы. Вследствие этого общая сумма в разделе «Кто подавал жалобу» получается больше общего числа всех поданных жалоб. Между тем целью учета жалоб по категориям жалобщиков является выяснение тех социальных групп, из среды которых исходят жалобы на те или иные неправильности в работе Советского аппарата. Таким образом, в данном случае единицей счета должна являться жалоба, а не жалобщик, и упомянутый раздел должен быть озаглавлен «Распределение жалоб по социальному составу жалобщиков». Поэтому характеристика каждой жалобы по социальному положению того лица или группы, от которых она исходит, должна определяться лишь одной единицей, и итог в этом разделе должен быть равен общему числу всех поданных жалоб» [7, арк. 2].

Такім чынам, зварот, які падаваўся грамадзянінам у Бюро Скаргаў асабіста або па пошце, падлягаў абавязковай рэгістрацыі для пацверджання факту прыёму. Пасля рэгістрацыі скарга ці заява перадаваліся на разгляд намесніку загадчыка Бюро, які дакладваў аб ёй загадчыку або сам накладаў рэзалюцыю, калі ведаў, якому супрацоўніку Бюро накіраваць гэту скаргу на выкананне. Распараджэнні загадчыка і яго намесніка павінны былі выконвацца тэрмінова ў дзень накладання на скаргу рэзалюцыі; гэта кантралявалася з дапамогай спецыяльных картак. У рэестры Бюро Скаргаў неабходна было адзначаць, што зроблена па скарзе і якое канчатковае рашэнне прынята. Нарэшце, для высвятлення прычын недахопаў у рабоце дзяржаўных органаў, якія ўказваліся ў зваротах, праводзіўся аналіз скаргаў і заяў. А з мэтай правядзення даведачнай работы па выкананых скаргах і заявах ствараліся картатэкі, прозвішчы заяўцеляў у якіх размяшчаліся ў алфавітным парадку.

Вывучэнне дзейнасці Бюро Скаргаў НК РСІ БССР дазваляе нам даведацца аб асаблівасцях работы са зваротамі грамадзян у першыя дзесяцігоддзі існавання БССР. Аналіз інструкцый для Бюро Скаргаў дае магчымасць вызначыць асаблівасці тагачаснага справаводства па зваротах грамадзян, парадак разгляду зваротаў. Гэтыя звесткі маюць для нас вялікае значэнне, бо менавіта ў разглядаемы перыяд былі закладзены асновы работы са зваротамі грамадзян, і сёння мы можам выкарыстаць напрацоўкі сваіх папярэднікаў па арганізацыі прыёму зваротаў, вызначэнні тэрміну іх разгляду, рэгістрацыі скаргаў і г.д.

**Літаратура**


1. Инструкция Бюро Жалоб Рабоче-Крестьянской Инспекции Белоруссии от 4 октября 1922 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 2. Спр.1.
2. Дакладная запіска загадчыка Бюро Скаргаў НК РСІ БССР І.А. Мількамановіча Народнаму Камісару РСІ БССР // НАРБ. Ф. 101. Воп. 2. Спр. 5.
3. Зборнік асноўных кіруючых матар’ялаў ЦКК-НКРСІ Беларусі. Мн., 1931.
4. Алфавіт Бюро Скаргаў НК РСІ БССР за 1927 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 2. Спр. 9.
5. *Ракаў Я.* Рацыяналізацыя справы кіраўніцтва. Мн., 1930.
6. *Козлов Ю.М.* Разрешение жалоб и заявлений трудящихся в органах советского государственного управления. М., 1955.
7. Цыркуляр НК РСІ РСФСР ад 4 ліпеня 1922 г. № 14 // НАРБ. Ф. 101. Воп. 2. Спр. 6.


## ПРОЦЕСС СОЗДАНИЯ И ОСНОВНЫЕ ЭТАПЫ В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ МУЗЕЯ ГРАФА МУРАВЬЁВА В ВИЛЬНО

**О. И. Яскович**

Создание Музея графа Муравьёва – противоречивое и неоднозначное явление в истории белорусского музейного дела. Во-первых, музей являлся одним из немногих мемориальных музеев своего времени. Во-вторых, в отличие от других музеев, он создаётся представителями правительственных структур, а не местной интеллигенции. В-третьих, интерес к музею обосновывается неоднозначным отношением к самой личности генерал-губернатора М.Н.Муравьёва, жестоко подавившего восстание К. Калиновского и проводившего впоследствии репрессионную политику на территории Литвы и Беларуси.

Открытие Музея графа Муравьёва состоялось 17 апреля 1901 г. Во время открытия А. Белецкий, председатель комиссии по созданию музея, в своём выступлении следующим образом определилцель этой структуры: «… возникла в Вильно мысль устроить музей… с тем…, чтобы исследователи эпохи Муравьёва легко и без затруднений находили в музее материалы, касающиеся их специальности, а посетители музея…, выносили бы отсюда высокое патриотическое чувство, лучшие впечатления и верные ука-